*1.* Актуальные проблемы советского музееведения : сб. науч. тр. / Центр. музей революции СССР ; редкол.: Л. И. Арапова [и др.]. – М. : [б. и.], 1987. – 122 с.

*2.* Дзяржаўны літаратурны музей Янкі Купалы [Электронны рэсурс] // Навіны музея. – Мінск, 2013. – Рэжым доступу: http://kupala-museum.by. – Дата доступу: 01.04.2017.

*3. Закс, А. Б.* Музейная экспозиция / А. Б. Закс // Российская музейная энциклопедия / редкол.: В. Л. Янин [и др.]. – М. : Прогресс : РИПОЛ классик, 2005. – 846 с.

*4. Сташкевіч, А. Б.* Стварэнне музейных экспазіцый. Этап навуковага праектавання / А. Б. Сташкевіч ; Беларус. ін-т праблем культуры // Навуковае праектаванне музейных экспазіцый : навук.-метад. зб. – Мінск : БелІПК, 1996. – Вып. 1. – 60 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# МАЛАДЗЁЖНЫ КЛУБ ЯК АДНА З ФОРМ ДУХОЎНА-МАРАЛЬНАГА ВЫХАВАННЯ ДЗЯЦЕЙ СТАРЭЙШАГА ШКОЛЬНАГА ЎЗРОСТУ Ў МУЗЕЙНАЙ ПРАСТОРЫ

***В. І. Мазалеўскі,***
*старшы навуковы супрацоўнік Нацыянальнага гісторыка-культурнага музея-запаведніка «Нясвіж»*

У адукацыйным працэсе сённяшняга дня актуальным застаецца пытанне выхавання новага пакалення, зацікаўленага ў гарманічным развіцці грамадства і здольнага рэалізаваць свае творчыя і духоўныя патрэбнасці. У дадзенай працы мы паспрабуем прасачыць цэлы ланцужок выхаваўчага працэсу: сям’я – школа – музей. Задачай сям’і з’яўляецца выхаванне новых прадстаўнікоў грамадства, якія нясуць у сабе генетычныя каштоўнасці роду. Задачай школы з’яўляецца не толькі адукацыйная дзейнасць, але і выхаванне ў чалавеку маральных каштоўнасцей. Музей у выхаванні падлетка сінтэзаваў у сабе намаганні сям’і і школы праз маладзёжнае аб’яднанне – клуб.

Музей валодае вялікім адукацыйным патэнцыялам. У ім падлетак мае магчымасць вывучаць багаты культурны і гістарыч-

ны матэрыял, з якога потым ён праводзіць адбор падзей, фактаў, людскіх лёсаў. Асабліва важна, калі вывучэннем культурна-гістарычнага матэрыялу займаюцца не толькі навукоўцы (музейшчыкі, гісторыкі, культуролагі), але і дзеці. Вядомы педагог-метадыст А. А. Вагін заўважыў, што «клуб з'яўляецца найбольш гнуткай формай, якая часцей за ўсё становіцца арганізацыйным цэнтрам цэлага шэрага пазакласных мерапрыемстваў» [1, с. 31].

Поспех работы клуба залежыць ад умення, жадання, ініцыятывы і ведаў яго куратара, ад умелага спалучэння розных відаў і форм заняткаў. Куратар клуба забяспечвае навуковае і метадычнае кіраўніцтва: кансультуе дзяцей, рэкамендуе неабходную літаратуру, дапамагае складаць планы, сістэматызаваць, ацэньваць і абагульняць сабраны матэрыял.

Музейныя клубныя праекты па некаторых крытэрыях нагадваюць курсы: іх аб'ядноўваюць узаемасувязь і значная працягласць заняткаў, наведванне іх адной і той жа групай удзельнікаў. Аднак існуюць і прынцыповыя адрозненні. Па-першае, заняткі ў рамках клубных праектаў праходзяць у прасторы музея і прадугледжваюць агляд архітэктурных помнікаў на гістарычных тэрыторыях, наведванне экспазіцый і выставак. Па-другое, мэты дадзеных праектаў больш канкрэтныя: не проста пазнаёміць удзельнікаў з той ці іншай дысцыплінай, а спрыяць набыццю даследчых навыкаў, вопыту публічнага выступлення і фарміраванню беражлівых адносін да гісторыка-культурнай спадчыны.

Навуковымі супрацоўнікамі Нацыянальнага гісторыка-культурнага музея-запаведніка «Нясвіж» рэалізуецца маладзёжны праект – клуб ЮНЕСКА «Кліа». Асноўным аб'ектам для правядзення заняткаў клуба з'яўляецца сектар па навукова-экскурсійнай працы «Палацавы ансамбль», аднак асобныя заняткі могуць праходзіць і на іншых тэрыторыях музея-запаведніка.

У клубнай рабоце музея-запаведніка «Нясвіж» асаблівая ўвага надаецца выбару тэматыкі даследавання падлетка і вызначэнне напрамку дзейнасці. Само даследаванне падзяляецца на два кірункі: тэарэтычны (гутаркі, лекцыі, даклады, канферэнцыі, віктарыны, самастойная работа) і практычны (экскурсіі,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

паходы, экспедыцыі, практыкумы). Для бягучай арганізацыйнай і тэхнічнай працы на агульным сходзе з членаў клуба абіраюцца старшыня, намеснік старшыні, сакратар, казначэй, рэвізор і інфармацыйны менеджар. Яны па ўзгадненні з куратарам прызначаюць заняткі клуба, даюць асобныя даручэнні яго членам і правяраюць выкананне заданняў, арганізоўваюць перапіску, сочаць за своечасовасцю афармлення і правільнасцю захавання дакументацыі.

Для вызначэння тэматыкі клуба не абавязкова мець ужо гатовы матэрыял. Самастойная работа членаў клуба па выяўленні, пошуку, зборы і вывучэнні матэрыялу з’яўляецца каштоўным і прывабным у яго дзейнасці. Праграмай клуба прадугледжваецца паглыбленае вывучэнне культурнага і гістарычнага матэрыялу ў цэлым і агляд асобных музейных аб’ектаў, а таксама вывучэнне канкрэтных тэм. У клубе можа вывучацца і канкрэтны перыяд у гісторыі краіны, напрыклад, Полацкае княства, Вялікае Княства Літоўскае.

Клуб ЮНЕСКА «Кліа» працуе па плане, зацверджаным на сходзе ў пачатку навучальнага года. У плане вызначаны мэта і задачы, якія паказваюць розныя формы работы клуба: сустрэчы з удзельнікамі гістарычных падзей, правядзенне экскурсій, вечароў, канферэнцый, выпуск насценгазет, пералік індывідуальных і групавых даследаванняў, паход ці экспедыцыя, выніковае мерапрыемства, тэрміны і адказныя за іх арганізацыю і правядзенне. Праца клуба ў канцы навучальнага года завяршаецца выніковымі заняткамі, якія праводзяцца ў форме вечара або канферэнцыі. Звычайна заслухоўваюцца кароткая справаздача аб выніках работы за год і лепшыя 5–6 дакладаў, якія характарызуюць асноўны кірунак працы клуба [2, с. 94].

Асноўным метадам працы клуба з’яўляецца самастойная дзейнасць падлеткаў. Кожны член маладзёжнага аб’яднання з улікам індывідуальных інтарэсаў выбірае тэму і самастойна працуе над ёй. У выніку працы клуба кожны з яго членаў авалодвае пэўнымі ўменнямі і навыкамі даследчай дзейнасці: умее складаць бібліяграфію і анатацыю, асвойвае працу з гістарычнай і навуковай літаратурай, з дакументальнымі матэрыяламі,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

вучыцца запісваць успаміны, збіраць краязнаўчы матэрыял, карыстацца лагічнымі прыёмамі.

Адной з найважнейшых задач клуба з'яўляецца збор матэрыялаў для далейшага іх выкарыстання ў працы музея. Члены маладзёжнага аб'яднання з захапленнем займаюцца пошукамі гістарычных дакументаў, фактаў і звестак. У працэсе збору матэрыялаў арганізуюцца сустрэчы і гутаркі з удзельнікамі гістарычных падзей. Адукацыйнае і выхаваўчае значэнне гэтых сустрэч і гутарак велізарнае ў першую чаргу для самавыхавання маральнасці і адказнасці. Звесткі, атрыманыя з апавяданняў і гутарак удзельнікаў гістарычных падзей, з'яўляюцца каштоўнымі гістарычнымі крыніцамі. Збор краязнаўчых матэрыялаў з'яўляецца першай і важнай часткай даследчай працы падлеткаў, якія наведваюць пасяджэнні клуба ЮНЕСКА «Кліа». Назапашванне неабходных звестак і фактаў з'яўляецца своеасаблівай падрыхтоўкай да ўласнага даследавання. Усе запісы апавяданняў і відавочцаў гістарычных падзей, звесткі, атрыманыя з перапіскі, а таксама архіўныя і музейныя дакументы, назіранні, сабраныя ў паходах, вывучаюцца, групуюцца па тэмах, сістэматызуюцца, апрацоўваюцца і выкарыстоўваюцца для падрыхтоўкі дакладаў і паведамленняў, нарысаў і зборнікаў, альбомаў і выставак.

Падводзячы вынік вышэйсказанаму, варта адзначыць, што поспехі клубнай дзейнасці ў многім залежаць ад уменняў куратара клуба развіваць і падтрымліваць пазнавальныя інтарэсы падлеткаў, ствараць атмасферу творчасці, групавой адказнасці. Праца клуба ЮНЕСКА «Кліа» спрыяе ўсебаковаму гарманічнаму развіццю асобы кожнага дзіцяці, забяспечваючы мэтазгоднасць і эфектыўнасць педагагічнага ўзаемадзеяння, павышэнне якасці адукацыі, фарміраванне маральнасці ў падрастаючага пакалення.

---

1. *Краевский, В. В.* Общие основы педагогики : учеб. для студ. высш. пед. учеб. заведений / В. В. Краевский. – М. : Академия, 2003. – 256 с.

2. *Столяров, Б. А.* Педагогика художественного музея: от истоков до современности : учеб. пособие / Б. А. Столяров. – СПб. : СпецЛит, 1999. – 222 с.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ